# РАЗАМ СА СКАРЫНАМ

У выставачнай зале Навуковай бібліятэкі Полацкага дзяржуніверсітэта працуе выстава па выніках фотаконкурсу «Сфатаграфуйся са Скарынам», які па ініцыятыве Навуковай бібліятэкі ПДУ быў аб'яўлены яшчэ вясной. Усім жадаючым прапаноўвалася даслаць свой арыгінальны тэматычны фотаздымак і даць яму назву. У конкурсе прынялі ўдзел студэнты ўніверсітэта, жыхары Полацка і Наваполацка, а таксама іншых гарадоў Беларусі.

Вынікі творчага праекта прадстаўлены ў экспазіцыі. Выстава працягнецца да канца верасня.

**Алена КАЛЕНІК.**